✓У Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага **1 верасня** адкрылі выставу **«Снова в школу»**, прысвечаную Дню ведаў. Яе арганізавалі сумесна з НББ, Беларускім дзяржаўным музеем народнай архітэктуры і побыту, калекцыянерамі Віктарам Суворавым і Аляксандрам Лугіным. Дэманструюцца прадметы, без якіх немагчыма ўявіць школьныя гады: фарфоравыя чарніліцы, пісьмовыя прыборы і статуэткі на школьную тэму, бюсты і статуэткі класікаў беларускай і рускай літаратуры, творы якіх уключаныя ў школьную праграму. Дэманструецца больш за 300 асобнікаў металічных і рознакаляровых скрэпак розных формаў і памераў, фірмовых і сувенірных, прывезеных з розных краінаў свету. НББ выставіла калекцыю буквароў, па якіх вучыліся ў розныя часы мінулага стагоддзя. Сярод рэдкіх выданняў – «Лемантар» 1925 г. мовазнаўцы, першага старшыні Інстытута беларускай культуры Сцяпана Некрашэвіча. Асобная частка выставы ўзнаўляе стары школьны клас, дзе дэманструюцца ўжо легендарная парта Фёдара Эрысмана і дошка, якой карыстаўся доктар фізіка-матэматычных навук, прэзідэнт Акадэміі навук Беларусі Мікалай Барысевіч. Згадаць школьныя гады можна да 31 кастрычніка.